неудовлетворительными. Так, в большинстве начальных учебных заведений Житковичского, Костюковичского, Луполовского, Туровского районов физкультурные занятия с мальчиками и девочками проводились в школьных коридорах или обычных учебных классах, совершенно не приспособленных для таких целей. Сами уроки из-за неосведомленности учителей в вопросах спорта проходили в форме рассказов, опросов о задачах введенного курса или простейших упражнений утренней физзарядки. Количество часов на изучение физкультуры отводилось от одного до двух часов в неделю. Естественно, эффект от такой учебной работы был крайне низким [7, л. 125; 14, л. 235].

Исследование показало, что физическое воспитание учащихся, несмотря на имеющиеся проблемы и недостатки, сыграло огромную роль в развитии силы, ловкости, волевых качеств детей и подростков. Молодое поколение, создавшее в предвоенные пятилетки мощную экономическую базу республики, мужественно и стойко сражавшееся в годы Великой Отечественной войны во имя Победы с фашистскими захватчиками, получило основы физической выносливости, волевой закалки, стойкости, идейной убежденности в период школьного обучения.

**Список использованных источников**

1. Белорусский государственный университет физической культуры: о времени, о спорте, о себе / под общ. ред. М. Е. Кобринского. – Минск : БГУФК, 2007. – 398 с.
2. Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). – Ф. 4п. Оп. 1. Д. 1757.
3. Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). – Ф. 4п. Оп. 1. Д. 1791.
4. Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). – Ф. 63п. Оп. 1. Д. 54.
5. Государственный архив Витебской области (ГАВт). – Ф. 1582. Оп. 1. Д. 641.
6. ГАВт. – Ф. 1582. Оп. 1. Д. 610.
7. Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). – Ф. 63п. Оп. 1. Д. 64а.
8. Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). – Ф. 63п. Оп. 1. Д. 37.
9. Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). – Ф. 63п. Оп. 1. Д. 70.
10. Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). – Ф. 63п. Оп. 1. Д. 71.
11. Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). – Ф. 63п. Оп. 1. Д. 72.
12. Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). – Ф. 4п. Оп. 1. Д. 1106.
13. Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). – Ф. 4п. Оп. 1. Д. 1787.
14. Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). – Ф. 4п. Оп. 1. Д. 1789.

## БАРАЦЬБА З ДЭЗЕРЦІРСТВАМ НА МАЗЫРШЧЫНЕ ВА ЎМОВАХ ПЕРАХОДУ АД ВАЙНЫ ДА МІРУ (1920–1921 гг.)

**М. М. Мязга**
**ГДУ імя Ф. Скарыны (Гомель)**

У сярэдзіне жніўня 1920 г. у Мінску пачынаюцца польска-савецкія мірныя перамовы. Яны будуць працягнуты ў канцы верасня – пачатку кастрычніка ў Рызе і прывядуць да падпісання 12 кастрычніка прэлімінарнага мірнага дагавора і пагаднення аб перамір'і. Яно ўступіла ў сілу

18 кастрычніка 1920 г., што азначала завяршэнне польска-савецкай вайны 1919–1920 гг. Але яшчэ не быў падпісаны канчатковы мірны дагавор. Перамовы аб яго палажэннях працягваліся да 18 сакавіка 1921 г. Фактычна са жніўня 1920 г. па сакавік 1921 г. ССРБ перажывала пераходны перыяд ад вайны да міру. Гэтая сітуацыя параджала шматлікія нестандартныя праблемы і супярэчнасці ў грамадскім жыцці. Адной з іх стала дэзерцірства салдат Чырвонай Арміі, стомленых шматгадовай вайной (многія ваявалі яшчэ ў Першую сусветную вайну). Спецыфіка Мазырскага павета заключалася ў тым, што ён быў памежны з лініяй савецка-польскага фронту, а затым, пасля заключэння перамір'я, з нейтральнай зонай. Такая сітуацыя стварала дадатковую ваенна-палітычную напружанасць у рэгіёне, спрыяла і распаўсюджванню дэзерцірства [1. с. 181–182].

Мазырская павятовая камісія па барацьбе з дэзерцірствам (у дакументах часта фігуруе скарочаная назва паветкамдэзерцір) пачала сваю дзейнасць 15 ліпеня 1920 г. яшчэ ва ўмовах наступлення Чырвонай Арміі на Варшаву [2, л. 26]. Камісія не мела ў наяўнасці значных сіл для выканання сваіх функцый. Нават на 5 студзеня 1921 г. яна налічвала толькі 7 чалавек каманднага складу, 3 чырвонаармейцы і 5 коней. Пры камісіі меўся атрад спецыяльнага прызначэння. Па штату ён павінен быў налічваць 65 чалавек, але рэальна меў толькі 55. У распараджэнні атрада было 6 коней [3, л. 6]. І ў далейшым слабасць меўшыхся ў распараджэнні камісій па барацьбе з дэзерцірствам сіл заставалася істотнай праблемай. 27 студзеня 1921 г. камісія па барацьбе з дэзерцірствам ССРБ выдала загад, у якім адзначаўся «надзвычай нездавальняючы стан атрадаў камдэзаў, адсутнасць абмундзіравання». У якасці недахопаў адзначалася недастатковасць палітработы і нездавальняючая разведработа. Эфектыўнай рабоце атрадаў камісій перашкаджала неэфектыўная работа чыгунак. У якасці недапрацоўкі ўказвалася «на вельмі недастатковае прымяненне рэпрэсій да тых, хто хаваў дэзерціраў у гарадах, – непрыцягненне да маёмаснай і асабістай адказнасці дамавых камітэтаў» [4, л. 24].

Першы месяц працы паветкамдэзерцір у Мазыры прывёў да затрымання 256 дэзерціраў. Прычым стаўленне да затрыманых было дастаткова паблажлівае. У адносінах да 246 затрыманых было прызнана, што яны апынуліся сярод дэзерціраў у «сілу слабасці волі». І толькі адзін быў перададзены ў рэвалюцыйны трыбунал [2, л. 90].

З 28 жніўня1920 г. на ўсёй тэрыторыі ССРБ праводзілася мабілізацыя ў Чырвоную Армію адразу 12 узростаў. Гэтая кампанія сутыкнулася з цяжкасцямі. У гэтай сувязі камісія ССРБ па барацьбе з дэзерцірствам выдала 5 верасня адмысловы загад. Ён прадпісваў караць не толькі тых, хто ўхіляўся ад мабілізацыі, але і іх сваякоў. Для апошніх асноўнай мерай пакарання была канфіскацыя маёмасці [5, л. 129].

Органы савецкай улады спрабавалі спалучаць рэпрэсіўныя метады з абвяшчэннем амністыі. Адна з іх была абвешчана цэнтральнай камісіяй РСФСР па барацьбе з дэзерцірствам у сувязі з 3-й гадавінай Кастрычніцкай

рэвалюцыі. Цалкам вызваляліся ад адказнасці тыя, для каго пакаранне не прадугледжвала пазбаўлення волі. Для астатніх прадугледжвалася датэрміновае вызваленне і скарачэнне тэрмінаў пазбаўлення волі [6, л. 151–151 адв]. У снежні 1920 г. у Мазырскім павеце быў абвешчаны тыдзень добраахвотнай яўкі дэзерціраў і «бандытаў». У справаздачы павятовай камісіі па барацьбе з дэзерцірствам за снежань 1920 г. адзначалася, што кампанія па добраахвотнай яўцы дала мінімальныя вынікі. Добраахвотна з'явілася толькі 250 дэзерціраў. А ўсяго за снежань здалося ўладам і затрымана 998 чалавек [3, л. 5]. Па выніках працы камісіі ў канцы снежня адзначалася, што з валасцей Мазырскага павета бандытызм і дэзерцірства адсутнічаюць ва ўсіх валасцях за выключэннем Камаровіцкай і Мелашковіцкай. У якасці асноўнай прычыны дэзерцірства называлася частая змена ўлад [6, л. 1, 2 адв.].

У студзені 1921 г. камісія адзначыла, што «сітуацыя з дэзерцірствам паляпшаецца». Сапраўды, затрыманы быў толькі 251 дэзерцір, значна менш, чым у папярэднім месяцы. З іх добраахвотна з'явіліся 65 чалавек [3, л. 45, 53]. Блізкая лічба затрыманых дэзерціраў і за люты – 272, з іх 40 здаліся добраахвотна [3, л. 135, 138]. Аднак праблема заставалася, сведчаннем чаго з'яўляецца тэлеграма наркамата па ваенных справах ССРБ ад 18 лютага 1921 г. У ёй тлумачылася, што грамадзяне, якія не з'явіліся па месцы жыхарства ў ваенкамат для пастаноўкі на ўлік, а таксама і не заявіўшыя пра перамену месца жыхарства разглядаюцца як дэзерціры [6, л. 130].

З 20 па 27 лютага 1921 г. павятовая камісія зноў абвясціла тыдзень добраахвотнай здачы дэзерціраў. Усім, хто з'явіцца добраахвотна, савецкая ўлада гарантавала «поўнае дараванне», вызваленне «ад асабістага і маёмаснага пакарання і лічыць іх чырвонаармейцамі з дня ўступлення ў рады Чырвонай Арміі». Добраахвотна здаўшымся гарантавалася сельскагаспадарчая дапамога. Пры гэтым дэзерціры папярэджваліся, што пасля завяршэння тыдня добраахвотнай яўкі «магучая рука рабоча-сялянскай улады калёным жалезам знішчыць дэзерцірства і бандытызм у Савецкай Беларусі» [7, л. 11]. Але палажэнне адносна «магучай рукі» не было рэалізавана неадкладна. 22 лютага 1921 г. ЦВК ССРБ прыняў пастанову, згодна якой у сувязі з трэцяй гадавінай Чырвонай Арміі абвяшчалася чарговая амністыя дэзерцірам. Мазырская камдэз прыняла інструкцыю па рэалізацыі гэтай пастановы. Спыняліся справы ў дачыненні да дэзерціраў і іх памагатых, асуджаныя вызваляліся, канфіскацыі маёмасці адмяняліся [4, л. 40].

Аднак адзначаныя меры не прывялі да выкаранення дэзерцірства. У загадзе камісіі па барацьбе з дэзерцірствам у ССРБ ад 1 сакавіка 1921 г. адзначалася, што на працягу двух тыдняў добраахвотнай яўкі «дэзерціры далёка не ўсе з'явіліся», многія працягваюць хавацца ў лясах і «з наступленнем вясны не выключаецца магчымасць развіцця дэзерцірства ў больш шырокіх маштабах» [4, л. 40].

Часам барацьба з дэзерцірствам параджала канфліктныя сітуацыі паміж структурамі, якія гэтую барацьбу вялі, і прадпрыемствамі і арганізацыямі. Так, член рэвваенсавета Заходняга фронту І. Уншліхт дазволіў прымаць

на працу на лесанарыхтоўкі чырвонаармейцаў, якія знаходзіліся ў водпуску. Адпускнікі сталі выкарыстоўваць гэта, каб заставацца ў тыле і пасля заканчэння адпачынкаў. Таму камісія па барацьбе з дэзерцірствам Заходняга фронту ў тэлеграме ад 17 лютага 1921 г. папярэдзіла як саміх чырвонаармейцаў, так і прыняўшых іх на працу кіраўнікоў лесанарыхтоўчых прадпрыемстваў аб строгай адказнасці пры выяўленні такіх выпадкаў [6, л. 131]. Для кіраўнікоў установаў важна было ліквідаваць праблему з недахопам рабочай сілы. Таму яны былі незадаволеныя арыштамі сваіх работнікаў як дэзерціраў. Так, кіраўніцтва Калінкавічскага чыгуначнага ўчастка накіравала ў Маскву тэлеграму, у якой паведамляла аб арыштах чыгуначнікаў як дэзерціраў і прасіла спыніць «незаконныя арышты», бо яны цягнуць за сабою дэзарганізацыю транспарту [6, л. 53]. Такая пазіцыя знайшла разуменне ў цэнтральнага савецкага кіраўніцтва. 5 студзеня 1921 г. начальнікам мабілізацыйнага ўпраўлення галоўнага штаба Чырвонай Арміі была разаслана тэлеграма, у якой адзначалася: «З прычыны вялізнага недахопу рабочай сілы на чыгунцы і неабходнасці па ўмовах перажываемага моманту хуткімі тэмпамі аднавіць разбураныя ваеннымі дзеяннямі чыгуначныя лініі дазволена пакідаць на чыгунцы дэзерціраў старэйшых узростаў, а менавіта, нарадзіўшыхся ў 1893 г. і старэйшых гадоў» [6, л. 121].

Каб затрымліваць дэзерціраў, на чыгуначных станцыях выстаўляліся кантрольныя пункты [3, л. 5 адв.]. Але хутка выявілася іх неэфектыўнасць. Дэзерціры аддавалі перавагу прасёлачным дарогам для вяртання дамоў. 15 студзеня 1921 г. камісія прыняла рашэнне зняць кантрольныя пункты са станцый Муляраўка, Жыткавічы, Ельск «у сувязі з іх непатрэбнасцю» і выставіць пасты на прасёлачных дарогах [3, л. 21]. Згодна загаду па паветкамдэзерцір ад 15 студзеня 1921 г. кантрольныя пункты ўстанаўліваліся на дарогах у Мялешкавіцкай, Лучыцкай і Камароўскай валасцях [8, л. 3].

Звычайна да большасці затрыманых дэзерціраў, як ужо адзначалася, прымяняліся адносна мяккія меры. Так, у снежні 1920 г. з 998 затрыманых дэзерціраў 676 чалавек былі прызнаны «нязлоснымі», 235 адпраўлены ў штрафную роту, у асобы аддзел было накіравана 16 чалавек, у рэўтрыбунал – 17 [3, л. 5]. У студзені 1921 г. з 250 захопленых і здаўшыхся дэзерціраў 202 (80 %) былі прызнаны нязлоснымі [3, л. 53]. Па меры таго, як барацьба з дэзерцірствам уступала ў завяршальную фазу, падыход да затрыманых станавіўся больш жорсткім. 26 лютага 1921 г. была выдадзена пастанова СНК ССРБ, якая патрабавала перадаваць у трыбуналы наступныя катэгорыі спраў: а) дэзерцірства ў баявой абстаноўцы; б) дэзерцірства асоб каманднага складу; в) дэзерцірства, звязанае з бандытызмам; г) укрывальніцтва і дапамога дэзерцірам з боку службовай асобы [4, л. 40]. У красавіку са 157 затрыманых дэзерціраўда катэгорыі нязлосных было аднесена толькі 68 (43 %) [5, л. 32].

У якасці адной з рэпрэсіўных мер, што прымяняліся да дэзерціраў, была канфіскацыя маёмасці. Так, у справаздачы Мазырскай паветкамдэзерцір за першы месяц дзейнасці ў ліпені – жніўні 1920 г. адзначаецца 10 выпадкаў

канфіскацыі маёмасці. Было адабрана шынялёў – 4, шараварaў – 17, нацельнай бялізны – 19, вінтовак і стрэльбаў – 17 [2, л. 91 адв.]. У справаздачы камісіі за снежань 1920 г. прыгадвалася канфіскацыя 1 каня і 14 галоў буйной рагатай жывёлы [3, л. 5]. За студзень 1921 г. камісія вынесла 37 пастаноў аб канфіскацыі маёмасці. Было канфіскавана 8 кароў, 6 быкоў, 11 авечак, 2 свінні, 5 коней [3, л. 47]. Прычым пры канфіскацыі жывёлы павінен быў канфіскоўвацца і фураж для яе ўтрымання [6, л. 103].

Пад канфіскацыю траплялісі і самыя дробныя рэчы ўласнага ўжытку. У дэзерціра з в. Вішанькі Панфілева Івана Назаравіча былі канфіскаваны адна пара валенак і адны цёплыя кальсоны. У в. Новае ў Трашко Цярэнція Фаміча канфіскавалі адну пару нацельнай бялізны. У Казянца Івана Мікітавіча з в. Вярхі канфіскавалі адзін кусок палатна. У Любіна Фёдара Аляксеевіча з в. Старое – адзін хамут, адну пару нацельнай бялізны, адзін піджак. У Яцухіна Івана Фаміча – адны шаравары, два кацялкі [8, л. 3 адв.].

З дэзерціраў спаганяліся штрафы. Так, Павел Задворскі павінен быў заплаціць у снежні 1920 г. 10 000 руб. за тое, што яшчэ ў 1919 г. не з’явіўся на паверачны збор [3, л. 5 адв.]. З 1 па 23 лютага 1921 г. на дэзерціраў і тых, хто іх хаваў, было накладзена штрафаў на 2 940 978 руб. Прымянялася практыка накладання штрафаў на цэлыя воласці ў адпаведнасці з загадам рэспубліканскай камісіі ССРБ па барацьбе з дэзерцірствам [3, л. 161, 152].

У барацьбе з дэзерцірствам улады прымянялі калектыўную адказнасць насельніцтва. Рэспубліканская камдэз 30 лістапада 1920 г. выдала загад, які патрабаваў прыняць наступныя меры па барацьбе з дэзерцірамі: 1) узяць у насельніцтва падпіску аб неўкрывальніцтве дэзерціраў; 2) арганізацыя пяці і дзесяцідворак, якія «абавязаць, што кожны старэйшы пяцідворкі сочыць у сваім раёне, каб не было дэзерціраў. У выпадку выяўлення дэзерціраў у яго раёне нясе такую ж адказнасць, як і дэзерцір». У загадзе ўтрымлівалася пагроза, што вінаватыя ў яго невыкананні будуць прыцягвацца да суду ваеннага трыбуналу [5, л. 42].

У сваю чаргу Мазырская павятовая камісія выдала 19 студзеня 1921 г. загад аб увядзенні кругавой парукі. У ім было сказана, што «кожны селянін павінен адказваць перад рабоча-сялянскай уладай за ўкрывальніцтва ў сяле ці вёсцы як свайго сваяка, так і яго бліжэйшага суседа». За непадпісанне кругавой парукі на воласць накладаўся штраф ад 100 тыс. да 1 млн руб. [8, л. 5–5 адв.]. У вёсках прызначаліся старэйшыя па пяцідворку ці дзесяцідворку. Яны павінны былі перыядычна абыходзіць свае двары і пры знаходжанні дэзерціраў, асоб без дакументаў арыштоўваць іх і перадаваць старшыні сельскага савета. Пяцідворныя і дзесяцідворныя павінны былі не радзей, чым два разы на тыдзень, разам з сельсаветам абыходзіць усю вёску і аб выніках аблавы паведамляць пісьмова ваеннаму камісару па барацьбе з дэзерцірствам [7, л. 2 адв.]. Загад Мазырскай павятовай камісіі ад 19 студзеня 1921 г. быў рэкамендаваны спецыяльным загадам камісіі па барацьбе з дэзерцірствам ССРБ ад 12 лютага 1921 г. як прыклад для працы іншых павятовых камдэз рэспублікі [5, л. 34].

Пераход савецкага кіраўніцтва да больш жорсткіх мер у барацьбе з дэзерцірствам звязаны з тым, што яно не выключала вясной 1921 г. аднаўлення вайны з Польшчай. Таму трэба было забяспечыць стабільны тыл для Чырвонай Арміі [9, с. 162].

У разглядаемы час існавала паняцце не толькі ваеннага, але і працоўнага дэзерцірства. У студзені 1921 г. у Мазырскім павеце была створана камісія па барацьбе з працоўным дэзерцірствам. У прыватнасці, за ўхіленне ад гужавой павіннасці прымяняліся наступныя меры пакарання: першы раз – прыцягваць да пазачарговага нараду на тры дні, у другі раз – на пяць дзён, трэці раз – арышт [6, л. 97–97 адв.].

Падпісанне Рыжскага мірнага дагавора, ліквідацыя нейтральнай зоны, пачатак масавай дэмабілізацыі з Чырвонай Арміі змянілі грамадска-палітычную сітуацыю і, разам з мерамі па барацьбе з дэзерцірствам, паспрыялі таму, што яно пайшло на спад. Але і з наступленнем міру на Мазыршчыне сітуацыя заставалася напружанай, што было ў многім звязана з дзейнасцю антысавецкіх фармаванняў з тэрыторыі Польшчы.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Рижский мир в судьбе белорусского народа. 1921–1953 гг. : в 2 кн. / редкол.: А. А. Коваленя [и др.]. – Минск : Белорусская наука, 2014. – 393 с.
2. Занальны дзяржаўны архіў у г. Мазыры (далей – ЗДАМ). – Ф. 220. Воп. 1. Спр. 9.
3. ЗДАМ. – Ф. 220. Воп. 1. Спр. 16.
4. ЗДАМ. – Ф. 220. Воп. 1. Спр. 13.
5. ЗДАМ. – Ф. 220. Воп. 1. Спр. 2.
6. ЗДАМ. – Ф. 220. Воп. 1. Спр. 1.
7. ЗДАМ. – Ф. 220. Воп. 1. Спр. 14.
8. ЗДАМ. – Ф. 220. Воп. 1. Спр. 15.
9. Мельтюхов, М. Советско-польские войны / М. Мельтюхов. – 2-е изд. испр. и доп. – М. : Яуза, Эксмо, 2004. – 672 с.

# ИСТОРИЯ МОЕЙ СТРАНЫ ЧЕРЕЗ ИСТОРИЮ МОЕЙ СЕМЬИ: ВЕЧНЫЙ ДИАЛОГ ПОКОЛЕНИЙ

**Е. П. Нарижная**
**БТЭУ ПК (Гомель)**

Память о страшных событиях Второй мировой войны по-прежнему хранит каждая семья в Беларуси. И это крайне важно, так как без знания своей родословной, своих корней невозможно воспитать из нас – потомков – патриотов и хороших хозяев на земле белорусской. Когда родители рассказывают нам о Великой Отечественной войне через судьбы и несломленный дух тех, кого мы привыкли навещать на кладбище на Радуницу, рассказ о том, каково пришлось тогда нашей семье, нашим родным, позволяет глубже понять историю своей страны и прочувствовать смысл праздника Дня Победы. Это священная память о погибших на полях